Хроніка

# М. Дземянцей у «Новым жыцці»

У мінулую суботу Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Мікалай Іванавіч Дземянцей наведаў Ушацкі раён, дзе сустрэўся з выбаршчыкамі ў калгасе «Новае жыццё» імя П. Броўкі. Гэтую сустрэчу тут чакалі. Яшчэ ў верасні, на справаздачным партыйным сходзе, камуністы калгаса выказалі пажаданне, каб народны дэпутат іх акругі, абраны кіраўніком парламента рэспублікі, завітаў у гаспадарку, шчыра пагутарыў аб тым, што хвалюе працаўнікоў вёскі. І такая гутарка нарэшце адбылася. Шмат людзей сабралася ў калгасным клубе. Шмат пытанняў наспела ў іх да высокага госця.

М. І. Дземянцей напачатку падрабязна расказаў аб дзейнасці Вярхоўнага Савета, аб заканадаўчых актах, якія ў апошні час абмяркоўваліся і прымаліся дэпутатамі. Асаблівае месца ў яго выступленні было адведзена Закону БССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС». Падкрэсліўшы, што трагедыі такога характару і маштабу не было нідзе ў свеце, Старшыня Вярхоўнага Савета заявіў, што прадастаўленне льгот насельніцтву раёнаў з павышаным радыяцыйным фонам, матэрыяльная і медыцынская дапамога ўсім, хто пацярпеў ад катастрофы, выходзяць на першы план сярод шматлікіх эканамічных і сацыяльных задач. Адной Беларусі з гэтай бядой не справіцца.

У пытаннях, якія ставілі перад М. І. Дземянцеем калгаснікі, утрымлівалася няма ла крытыкі. Пенсіянер В. П. Самуйла, напрыклад, абурaўся тым, што Вярхоўны Савет вельмі марудна працуе, прынцце многіх рашэнняў абрастае таўшчэзным слоем славеснага шалупіння. М. І. Дземянцей растлумачыў выбаршчыкам, што інакш і не можа быць ва ўмовах існавання апазіцыі ў дэпутацкім корпусе, ды і наогул пры наяўнасці розных, часта супрацьлеглых пунктаў гледжання ў прадстаўнікоў парламента, упершыню сфарміраванага дэмакратычным шляхам.

Былы старшыня калгаса, пенсіянер С. Т. Клопаў выказаў нездаволенасць ростам цэн, а некаторыя прысутныя скардзіліся на тое, што вёска забяспечваецца таварамі значна горш, чым горад. У адказ людзі пачулі, што цэны, сапраўды, неабходна павысіць. Аднак, калі палавіну бюджэтнай датацыі, што выдзяляецца, да прыкладу, для кампенсацыі выдаткаў на вытворчасць мяса і малака, накіраваць на павышэнне заработнай платы, падаражанне прадуктаў не будзе ўспрымацца так балюча.

На сустрэчы ставіліся пытанні і мясцовага значэння: аб недахопе запчастак, неабходнасці будаўніцтва школы (тая, што ёсць, больш за 40 год не ведала рамонту), асабістых патрэбах сялянскіх сем'яў. Тут у размову ўступалі старшыня Віцебскага аблвыканкама У. П. Кулакоў, першы сакратар Ушацкага райкама КПБ В. Л. Дзятлаў, кіраўнікі калгаса. Гутарка аб набалелым працягвалася і пасля афіцыйнага заканчэння сустрэчы, у «кулуарах».

У той жа дзень М. І. Дземянцей наведаў жывёлаводчыя фермы гаспадаркі, музей народнага паэта Беларусі П. Броўкі.

Сяргей БУТКЕВІЧ.